# Асноўныя даты і падзеі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага

Этнічнай асновай Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) стала беларуская (літвінская) народнасць, якая стварылася шляхам зліцця этнасаў славянаў і заходніх балтаў у выніку змешвання плямёнаў яцвягаў, дайновы, мазураў, літвы і прусаў. Працэсы аславяньвання балцкіх плямёнаў працягваліся да XVI ст., і беларуская мова пашыралася на захад ад Вільні і Трокаў. Ядром пры ўтварэнні дзяржавы ў сярэдзіне XIII ст. сталі беларускія землі верхняга і сярэдняга Панямоння, а таксама землі па верхнім і сярэднім цячэнні р. Віліі. ВКЛ узнікла ва ўмовах пастаяннай жорсткай барацьбы з крыжацкай агрэсіяй і пад пагрозай мангола-татарскага нашэсця. Утварэнне дзяржавы дало магчымасць народам гэтага рэгіёну адстаяць сваю незалежнасць і стварыла ўмовы для далейшага сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага і культурнага іх развіцця. Уключэнне беларускіх і ўкраінскіх земляў у склад новастворанай дзяржавы мела пераважна добраахвотны характар, яно ажыццяўлялася шляхам пагадненняў вялікіх князёў літоўскіх з беларускімі і ўкраінскімі феадаламі, пры захаванні ільготаў, прывілеяў і паўнага самакіравання.

Утварэнне ВКЛ з цэнтрам у Новагародку адносіцца да 1240-х гг., калі па запрашэнні мясцовых баяраў тут стаў княжыць Міндоўг (сярэдзіна 1230-х – 1263). Амаль няспынная барацьба маладой дзяржавы з кааліцыяй Лівонскага ордэна, Галіцка-Валынскага княства, жамойцкіх, літоўскіх і яцвяжскіх князёў прымусіла Міндоўга пайсці на прымірэнне і саюз з Лівонскім ордэнам. У 1251 г. князь быў ахрышчаны паводле каталіцкага абраду, а ў 1253-м каранаваўся ў Новагародку каралеўскай каронай, прысланай ад імя папы Інакенція IV. Дзякуючы каранацыі Міндоўга каралеўскай каронай новая дзяржава была прызнаная еўрапейскімі дзяржавамі. У 1254 г. Міндоўг заключыў мір з галіцка-валынскім князем Данілам Раманавічам. Сын Міндоўга, Войшалк, перадаў князю Раману Данілавічу «Новгородок от Миндовга», а Слонім, Ваўкавыск «и все городы» – «от себе». Другі сын Данілы, Шварн Данілавіч, ажаніўся з дачкою Міндоўга. У 1258 г. Войшалк вярнуў княжанне ў Новагародку. Пасля паўстання жамойтаў, куршаў і земгалаў Міндоўг парваў саюз з Лівонскім ордэнам, адрокся ад каталіцызму і пачаў вайну з крыжакамі, але ў 1263-м у выніку змовы літоўскай знаці на чале з князямі Даўмонтам і Транятам быў забіты. Апошні стаў княжыць «во всей земле Литовской и Жемойти», аднак у 1264 г. быў забіты слугамі Міндоўга. Вялікім князем стаў Войшалк (1264–1267). Ён, абапіраючыся на беларускіх баяраў і галіцка-валынскіх князёў, заваяваў Нальшчаны, Дзяволтву, аб'яднаў Новагародскую, Пінскую, Полацкую і Віцебскую землі. У 1267 г. Войшалк перадаў уладу свайму швагру Шварну Данілавічу (1267–1270), які, пераадольваючы сепаратызм літоўскай знаці, працягваў аб'яднаўчы працэс і ўмацаванне дзяржавы.

Наступным вялікім князем стаў Трайдзень (1270–1282), які вёў барацьбу з Лівонскім ордэнам, князямі Нальшчанаў і Галіцка-Валынскага княства, якое імкнулася замацавацца не толькі на Палессі, але і ў Панямонні. У 1274 г. ён сіламі гарадзенцаў захапіў Драгічын і знішчыў большую частку яго насельніцтва. У адказ галіцка-валынскі князь Леў Данілавіч стварыў кааліцыю галіцка-валынскіх, смаленскіх, турава-пінскіх і інш. князёў і разам з татарскім войскам захапіў і разрабаваў Новагародак. У 1277 г. горад захапілі і разрабавалі татары – хаўруснікі Галіцка-Валынскага княства. У адказ Трайдзень разбіў аб'яднанае войска татараў і галіцка-валынскіх князёў каля Гародні. У 1279 г. літоўскае войска нанесла паражэнне лівонскім рыцарам, а ў 1281-м захапіла г. Герцыке (былую полацкую крэпасць), які Лівонскі ордэн быў вымушаны абмяняць на г. Дынабург.

Першым вядомым вялікім князем з новай дынастыі, прадстаўнікі якой кіравалі ВКЛ ажно да 1572 г., стаў Віцень (каля 1295–1316). Абапіраючыся на Новагародскае, Гарадзенскае, Полацкае і інш. княствы, ён працягваў умацоўваць дзяржаву. У 1294 г. ён задушыў паўстанне ў Жамойці, у 1298-м, выкарыстаўшы супярэчнасць паміж Лівонскім ордэнам і рыжскім арцыбіскупам, заключыў мірны дагавор з Рыгаю. У 1298 і 1305 гг. літоўскія войскі адбілі напады крыжакоў на Жамойць, а ў 1314-м – на крывіцкія землі, дзе ў бітве пад Новагародкам асабліва вызначылася войска пад камандаваннем Давыда Гарадзенскага. У 1315 г. вялікі князь са значным войскам уварваўся ў Прусію і ўзяў у аблогу моцны замак Хрыстмемель, падчас аблогі якога і загінуў. У час княжання Віценя да ВКЛ было далучана Полацкае княства (1307).

Значна пашырылася тэрыторыя ВКЛ пры наступніку Віценя Гедзіміне (1316–1341), які называў сябе ў граматах вялікім князем «літоўцаў і рускіх». У 1320 г. склад ВКЛ увайшла Віцебская зямля, у 1320–1330-я гг. – Берасцейская зямля, Менскае княства і Турава-Пінская зямля. Гедзімін заключыў саюз з мазавецкім князем Вацлавам (1322) і з польскім каралём Уладзіславам I Лакаткам (1325). Выкарыстаўшы супярэчнасці паміж Рыгай і Лівонскім ордэнам, ён нанёс некалькі паражэнняў крыжакам, меў палітычны ўплыў на Кіеў, Пскоў і Ноўгарад. У 1323 г. перанёс сталіцу ВКЛ у Вільню. Яшчэ пры жыцці Гедзіміна яго сыны атрымалі спадчыну: Манівід – Кернаў і Слонім, Карыят – частку Панямоння з Новагародкам, Альгерд, князь віцебскі, – Крэва і землі па Бярэзіне, Кейстут, бацька Вітаўта, – Трокі, Гарадзенскую і Берасцейскую землі, Нарымонт – Пінскую зямлю; Вільню з вобласцю атрымаў малодшы сын Яўнут, якому быў завешчаны вялікакняжацкі трон і які быў вялікім князем у 1341–1345 гг. У выніку змовы старэйшых братоў Альгерда і Кейстута Яўнут быў скінуты.

***Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ***

***(Працяг будзе)***